Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***А. Л. Багунова,***
настаўнік музычна-тэарэтычных дысцыплін, магістр педагагічных навук (ДУА «Магілёўская школа мастацтваў № 1»)

# КАМПАНЕНТЫ МЕТАДЫЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ФАКУЛЬТАТЫВА «БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ»

Праграма факультатыва «Беларуская народная творчасць», распрацаваная і эксперыментальна апрабаваная на базе Дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Магілёўская школа мастацтваў №1», арыентавана на навучанне і выхаванне навучэнцаў сродкамі беларускай традыцыйнай культуры ва ўмовах факультатыўных заняткаў.

Асноўная мэта факультатыва – гэта далучэнне вучняў малодшых класаў да беларускай традыцыйнай культуры. З мэты вынікаюць наступныя задачы:

- пазнаёміць вучняў з каляндарна-абрадавым цыклам свят і песень беларусаў, так сама развіваць вакальныя здольнасці вучняў, навыкі сольнага і ансамблевага выканання, прывіваць цікавасць да народнай музыкі і спеваў;

• садзейнічаць пашырэнню і паглыбленню ведаў пра фальклорныя традыцыі роднага краю, сваёй мясцовасці;

• выхоўваць мастацкі густ, любоў да роднай культуры, развіваць здольных творцаў у галіне этнакультуры.

Комплекснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне – гэта планаванне, праектаванне, распрацоўка і стварэнне аптымальнай сістэмы нарматыўнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, сродкаў навучання і кантролю. Асноўная мэта – стварэнне ўмоў для рэалізацыі патрабаванняў адукацыйных стандартаў і дасягнення неабходнай якасці падрыхтоўкі навучэнцаў.

Кампанентамі метадычнага забеспячэння з'яўляюцца сродкі нарматыўнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння. Да іх належаць: вучэбны план і праграма, план навучальнага занятка, навучальны наглядны дапаможнік, аудыё і відэа матэрыял, абсталяванне (інструменты, кампутар, праэктар), а таксама сродкі кантролю (тэсты, анкеты).

Зыходнымі дакументамі для распрацоўкі вучэбна-метадычнага комплексу з'яўляюцца адукацыйны стандарт, навучальны план і навучальная праграма, якія вызначаюць змест адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага навучання.

Навучальны план – вучэбна-праграмны дакумент, які, як правіла, ўстанаўлівае пералік, аб'ём, паслядоўнасць вывучэння вучэбных прадметаў, навучальных дысцыплін, адукацыйных абласцей, графік засваення зместу адукацыйнай праграмы, формы, віды і тэрміны правядзення вучэбных заняткаў, атэстацыі навучэнцаў, а таксама праходжання практыкі. Навучальны план можа ўключаць у сябе дзяржаўны кампанент і кампанент установы адукацыі [1].

Вучэбная праграма – вучэбна-праграмны дакумент, які, як правіла, вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета, вучэбнай дысцыпліны, тэмы, іх змест, час, адведзены на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, рэкамендуемыя формы і метады навучання і выхавання. Навучальныя планы, навучальныя праграмы ў залежнасці ад узроўню асноўнай адукацыі падзяляюцца на віды, якія вызначаюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь [1].

Для стварэння дзейснага комплекснага вучэбна-метадычнага забеспячэння веданне яго кампанентнага складу мае важнае значэнне ў многіх адносінах. Аб'ектыўна ўсталяваны склад комплекснага вучэбна-метадычнага забеспячэння дазваляе зразумець структуру такога забеспячэння, больш поўна выявіць і сістэматызаваць яго змест і сфармуляваць патрабаванні да яго стварэння.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Метадычнае забеспячэнне выкладання факультатыва «Беларуская народная творчасць» складаецца з шэрагу кампанентаў, кожны з якіх мае сваё месца і ролю. Да іх належаць: вучэбная праграма, план, тэматычны план, наглядны дапаможнік, відэа- і аўдыяматэрыял, паўрочны план факультатыўных заняткаў. Пры правядзенні факультатыўных заняткаў па прадмету «Беларуская народная творчасць» былі выкарыстаны кампаненты метадычнага забеспячэння розных узроўняў.

Для забеспячэння вучэбнага працэсу факультатыва «Беларуская народная творчасць» была распрацавана праграма. Гэтаму папярэднічаў аналіз ужо існуючых праграм у галіне дадатковай адукацыі.

Распрацаваная і эксперыментальна апрабаваная на базе Дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Магілёўская школа мастацтваў №1» праграма факультатыва «Беларуская народная творчасць» арыентуе на засваенне нацыянальных духоўных і маральных каштоўнасцей, творчы характар успрымання вучнямі вучэбнага матырыялу. Па плану праграмы прадугледжаны заняткі з перыядычнасцю адной гадзіны ў тыдзень, 35 гадзін у год. Паводле распрацаванага плана вучні на пачатковых занятках знаёмяцца з паняццем «фальклор», затым вывучаюць беларускія народныя святы, традыцыі, спевы, беларускі народны касцюм, казкі і інш.

Да кожнага занятку быў распрацаваны падрабязны план-канспект. У ім абавязкова апісана выкарыстанне рознага роду наглядных дапаможнікаў. Графічныя (раздатачны матэрыял); выяўленчыя (фотаздымкі); гукавыя (магнітафоныя запісы песень); экранна-гукавыя (тэлеперадачы, кінафрагменты, відэафільмы), а таксама і натуральныя прадметы (народныя касцюмы, прадметы побыту). Пры вывучэнні беларускіх народных святаў (Купалле, Загуканне вясны, Масленіца і г.д.) педагог сам дэманструе спевы песен дадзенага свята.

На занятку па тэме «Беларускі народны касцюм» у якасці нагляднага дапаможніка выкарыстоўвалася кніга В.А. Лабачэўскай «Беларускі народны касцюм. Крой і вышыўка» [2]. У межах вывучэння названай тэмы прадугледжана наведванне Музея этнаграфіі г. Магілёва з экскурсіяй па выставе беларускага народныага касцюма, у тым ліку рэгіёна Падняпроўя. Пры вывучэнні першага раздзелу карысна выкарытоўваць дапаможнік Н.Г. Мазурынай і А.Ю. Лозкі «Беларуская фальклярыстыка: каляндар і каляндарна-абрдавая паэзія» [3].

Наглядным дапаможнікам таксама з'яўляецца выкарыстанне аўдыя і відэаматэрыялаў. На кожным занятку гучаць спевы, не толькі тыя, што дэманструе педагог, але і ў запісы. Так на занятку, прысвечаным вывучэнню тэмы «Загуканне вясны», вучні праслухваюць песню «Вол



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

бушуе» у розных варыянтах. Такім чынам яны могуць параўнаць адрозненне спеваў розных рэгіёнаў.

На першым і апошнім занятку былі выкарыстаны сродкі кантролю. На першым занятку гэта было анкетаванне, якое паказала жаданне навучэнцаў вывучаць беларускую народную творчасць. На апошнім – выкарыстоўвалася анкета-тэст, якая паказала ўзровень ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання на факультатыве «Беларуская народная творчасць».

Такім чынам, эфектыўнасць працэсу распрацоўкі і ўкаранення вучэбна-метадычнага комплексу залежыць ад мноства фактараў, ключавыя з якіх – метадычная кампетэнтнасць педагога, яго здольнасць і гатоўнасць да дадзенай дзейнасці. Яна павінна ажыццяўляцца з улікам асноўных характарыстык і кампанентаў адукацыйнага працэсу.

Комплексны падыход да забеспячэння адукацыйнага працэсу патрабуе, каб усе яго кампаненты забяспечвалі навучальную, выхаваўчыю і развіццёвую дзейнасць педагога і вучэбна-пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, прычым на ўсіх яго этапах: на этапе падачы і ўспрымання навучальнага матэрыялу, на этапе замацавання і ўдасканалення ведаў і ўменняў, а таксама на этапах выкарыстання і кантролю.

## Спіс літаратуры


1. Аб зацвярджэнні палажэнняў аб вучэбна-метадычных комплексах па ўзроўнях асноўнай адукацыі : пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2011, № 167 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 22 лістапада 2011. – № 8/24424.
2. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм : крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З. И. Зимина. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 279 с.
3. Беларуская фалькларыстыка : каляндар і каляндарна-абрдавая паэзія : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, Н. Г. Мазурына. – Мінск : БДПУ, 2009. – 104 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова